# САЦЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў БССР (1943–1946 ГГ.)

**Д. С. Іванова**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4,
220030, г. Мінск, Беларусь, dashaivanovabelarus@gmail.com;
Навуковы кіраўнік – А. Ф.Паддубская, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

У артыкуле разглядаецца арганізацыя і ажыццяўленне сацыяльнага забеспячэння ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны ў БССР у 1943–1946 гг.; аналізуюцца змены ў арганізацыі дапамогі для сем'яў ваеннаслужачых і партызан, інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны; паказваецца дзейнасць органаў сацыяльнага забеспячэння.

***Ключавыя словы:*** арганізацыя дапамогі; інваліды Вялікай Айчыннай вайны; сацыяльнае забеспячэнне; сем'і ваеннаслужачых і партызан.

# СОЦИАЛЬНОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ УЧАСТНИКОВ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ В БССР (1943–1946 ГГ.)

**Д. С. Иванова**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4,
220030, Минск, Беларусь, dashaivanovabelarus@gmail.com;
Научный руководитель – Е. Ф. Поддубская, кандидат исторических наук, доцент*

В статье рассматриваются организация и реализация социального обеспечения участников Великой Отечественной войны в БССР в 1943–1946 гг.; анализируются изменения в организации помощи семьям военнослужащих и партизан, инвалидов Великой Отечественной войны; показана деятельность органов социального обеспечения.

***Ключевые слова***: организация помощи; инвалиды Великой Отечественной войны; социальное обеспечение; семьи военнослужащих и партизан.

Колькаснае павелічэнне кола людзей, якія патрабуюць дапамогі ад дзяржавы, прыводзіць да неабходнасці фарміравання заканадаўчай базы і стварэння органаў па дапамозе насельніцтву.

На органы сацыяльнага забеспячэння была ўскладзена праца па арганізацыі дапамогі інвалідам Вялікай Айчыннай вайны, якія склалі на 1 кастрычніка 1946 г. 90,5 тыс. чалавек [1, арк. 43], і сем'і ваеннаслужачых і партызан (на 1 лістапада 1944 г. на ўлік было ўзята 537 тыс. сем'яў, а ўжо на 1 лютага 1945 г. іх колькасць склала 681 тыс. [2, с. 19]).

Каб аблегчыць працу аддзелаў па сацыяльным забеспячэнні, 29 ліпеня 1943 г. на паседжанні Бюро ЦК КП(б)Б ствараецца Упраўленне па дзяржаўнаму забеспячэнню і бытавому ўладкаванню сем'яў ваенна-

служачых і партызан пры СНК БССР – фактычна ўзнікае разгалінаваная сістэма па аказанню падтрымкі насельніцтву.

Першапачатковыя мерапрыемствы Наркамата Сацыяльнага Забеспячэння былі накіраваны на дапамогу ў арганізацыі і праверку работы ў аддзелах па сацыяльным забеспячэнні БССР, выезд працаўнікоў наркамата для дапамогі ў рэгістрацыі грамадзян, якія атрымлівалі пенсію да вайны, арганізацыя механізму па прызначэнні пенсій інвалідам вайны. Таксама здзяйсняўся нагляд за ходам рамонту існуючых і арганізацыя новых дамоў інвалідаў, кантроль за стварэннем і арганізацыяй пратэзных майстэрань, арцелей інвалідаў [4, арк. 6–8].

На 1 студзеня 1945 года было адноўлена і арганізавана 25 дамоў інвалідаў, 1 дом выключна для інвалідаў вайны. Аднак, у некаторых дамах не была арганізавана дапаможная гаспадарка, быў недахоп бялізны і вопраткі, назіралася дрэннае ўпраўленне і кепскі рамонт [5, арк. 12–22 ].

Да 1945 г. урадам была ўсталявана праграма, што дапамагала разгортванню шырокай сетцы адмысловых лекавых устаноў: ствараліся адмысловыя шпіталі для інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ці асобыя аддзяленні для іх пры буйных паліклініках і шэрагу раённых паліклінік [6, с. 21–22]. Мела месца выданне пуцёвак у санаторыі, але колькасць была невялікая: за 1944 г. – 50 штук [5 , арк. 9].

Для эфектыўнай працы па забеспячэнні людзей з абмежаванымі магчымасцямі трэба было спарадкаваць сістэму вызначэння груп інваліднасці і наступную магчымасць працаўладкавання, бо інваліды III-й групы падлягалі абавязковаму ўладкаванню на працу (пры адмове працаваць яны пазбаўляліся пенсіі). Астатнія групы інвалідаў уладкаванню не падлягалі, але дзяржава праводзіла комплекс мераў для арганізацыі працы і для іх [7, с. 7]. З гэтай мэтай была адноўлена праца Урачэбна-працоўных экспертных камісій, вызначаны працоўныя рэкамендацыі інвалідам I-й і II-й груп, а таксама было ўведзена адмысловае паняцце “выразны анатамічны дэфект”, якое давала права на вызначэнне III-й групы інваліднасці, здольным працаваць па сваёй асноўнай прафесіі.

Перакваліфікацыя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны і іх далейшае працаўладкаванне лічылася найлепшай формай адаптацыі ў грамадстве. Арцелі і кааперацыі павінны былі арганізоўвацца выключна з ліку інвалідаў і стварацца ў розных галінах прамысловасці. Аднак большасць інвалідаў не працавалі ў арцелях, а самастойна ўладкоўваліся на працу, асноўным месцамі працы інвалідаў у гэты перыяд з’яўлялася сельская гаспадарка і савецкія ўстановы [1, арк 6].

Вялікую ролю ў аказанні матэрыяльнай дапамогі інвалідам вайны і сіротам адыгралі калгасныя касы ўзаемадапамогі [8, арк. 25]. У снежні

1944 г. у адпаведнасці з пастановай “Аб мерах дапамогі сем’ям франтавікоў і інвалідаў Айчыннай вайны” была арганізавана работа па зборы сродкаў у Фонд дапамогі сем’ям ваеннаслужачых, партызан і інвалідаў Айчыннай войны. Пры Упраўленні па дзяржаўным забеспячэнню была створана Рэспубліканская камісія для ўліку і размеркаванню сродкаў, якія паступаюць у гэты фонд.

Значным заставалася пытанне жылля. Будаўніцтву і аднаўленню жылога фонду спрыяла шэфская дапамога горада найбольш пацярпеўшым у гады вайны раёнам, ствараліся спецыяльныя будаўнічыя фонды і брыгады [9, с. 65].

Для забеспячэння інвалідаў прадуктамі харчавання ў буйных гарадах арганізоўваліся спецыяльныя крамы і сталовыя, у раёнах ствараліся спецыяльныя паліцы ў крамах і адвадзіліся сталы ў сталовых [4, арк. 6].

Вялікую праблему для функцыянавання як аддзелаў сацыяльнага забеспячэння, так і аддзелаў Упраўлення стварала адсутнасць кваліфікаваных кадраў, цякучка працаўнікоў. На кастрычнік 1943 года адбылося ўкамплектаванне загадчыкаў раённымі аддзеламі сацыяльнага забеспячэння па 44 раёнах, аднак большасць з іх працавала ўпершыню (у 36 раёнах). Гэта стварала праблемы з прызначэннем і выплатай пенсій, арганізацыяй арцелей і майстэрань кааперацый інвалідаў [8, арк. 1–2]. У некаторых раёнах за кароткі час змянялася па 2–3 загадчыка аддзелаў Упраўлення, у выніку пытаннямі дапамогі займаліся шараговыя працаўнікі, якія былі не ў стане вырашыць узнікаючыя праблемы.

Некаторыя супрацоўнікі аддзелаў неадказна ставіліся да працы, таму ў Наркамат прыходзіла шмат лістоў і скаргаў інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны [3, арк 99–110]. Мелі месца выпадкі, калі з-за абыякавасці працаўнікоў інвалідам вайны прыйшлося пайсці жабраваць [3, арк 9]. Вялікае абурэнне сярод грамадскасці выклікаў артыкул у газеце «Звязда» пра фармалізм у падыходзе да спраў інвалідаў у Наркамаце [10, с. 2].

Такім чынам, у перыяд 1943–1946 гг. стварэецца разгалінаваная сістэма па аказанню падтрымкі насельніцтва, што праявілася ў з'яўленні Упраўлення па дзяржаўнаму забеспячэнню і бытавому ўладкаванню сем’яў ваеннаслужачых і партызан пры СНК БССР. Першапачатковыя мерапрыемствы былі накіраваны на дапамогу ў арганізацыі і праверку работы ў аддзелах па сацыяльным забеспячэнні БССР, удасканаленне механізму па прызначэнні пенсій інвалідам вайны і г.д. У 1943–1946 гг. былі адноўлены і арганізаваны 25 дамоў інвалідаў; ствaралася сетка адмысловых лекавых устаноў. Для эфектыўнай працы па забеспячэнні людзей з абмежаванымі магчымасцямі была спарадкавана сістэма вызначэння груп інваліднасці і магчымасць іх працаўладкавання. Вялікую ролю ў аказанні матэрыяльнай дапамогі інвалідам Вялікай Айчыннай вай-

ны і сіротам адыгралі калгасныя касы ўзаемадапамогі; для забеспячэння прадуктамі харчавання арганізоўваліся спецыяльныя крамы і сталовыя.

Але афармленне заканадаўчай сістэмы сацыяльнага забеспячэння не вырашала ўсіх праблем інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, сем'яў ваеннаслужачых і партызан. Часам прыманыя пастановы выконваліся фармальна, адсутнасць кваліфікаваных кадраў адбілася на якасці працы органаў сацыяльнага забеспячэння. Сістэма не была дасканалай, але змены ў арганізацыі сацыяльнай дапамогі, правядзенне дзяржавай комплексу сацыяльна-эканамічных мерапрыемстваў падтрымалі насельніцтва Беларусі ў цяжкі ваенны і пасляваенны час.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Отчет о численности и трудоустройстве инвалидов Отечественной войны за 1946 г. // НАРБ. Ф. 30. Воп. 5. Спр. 802. Арк. 68.

2. *Стрельченко Е. Л.* Система социального обеспечения в БССР (1943–1946 гг.) // Веснік БДУ. Сер. 3. 2011. № 1. С.16–20.

3.Протаколы заседаний партбюро и документы к ним // НАРБ. Ф. 102. Воп. 8. Спр. 6. Арк. 7.

4. Планы работы Наркомата и коллегии на 1944 год // НАРБ. Ф. 102. Воп. 3. Спр. 3. Арк. 12.

5. Отчет о работе Наркомата за 1944 год и протокол республиканского совещания заведующих областными отделами соцобеспечения и директоров домов инвалидов от 20–21 февраля 1946 года // НАРБ. Ф. 102. Воп. 3. Спр. 4. Арк. 23.

6. *Миловидская К. С.* Лечебная помощь инвалидам Отечественной войны. М.: Ин-т сан. просвещения, тип. изд-ва «Моск. Большевик». 1946.

7. *Вержбиловский П. П.* Трудовое устройство инвалидов Отечественной войны. Москва : Профиздат, 1943.

8. Материалы об организации работы органов соцобеспечения Белоруссии // НАРБ. Ф. 102. Воп. 3. Спр. 1. Арк. 58.

9. Сёмая сесія Вярхоўнага Савета БССР, 3-5 ліп. 1945 г.: Стэнагр. справаздача. Мн. : Дзярж. выд-ва БССР. 1947.

10. Фармальны падыход да справы. У наркамаце сацыяльнага забеспячэння БССР дрэнна рэагуюць на скаргі інвалідаў // Звязда. 1945. 23 мая. С. 2.